Источник: "Наша слова" - 2012-01-11

# Выстава ў сядзібе ТБМ

13 студзеня 2012 года ў рамках кампаніі “Будзьма” адбудзецца адкрыццё выставы з нагоды юбілею вядомага гісторыка беларускага мастацтва **Майі Яніцкай.**

Месца - сядзіба ТБМ у Менску па Румянцава, 13.

Пачатак імпрэзы ў 17.30. Уваход вольны.

# ЯНІЦКАЯ МАЙЯ МІХАЙЛАЎНА



Нарадзілася 22 траўня 1931 года на хутары Валянтынава Зарэчынскага сельсавета Плешчыніцкага р-на (цяпер Лагойскі р-н) Менскай вобл. У 1955 годзе атрымала вышэйшую адукацыю па спецыяльнасці эканаміст.

У 1970 г. скончыла вочную аспірантуру Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР (ІМЭФ АН БССР).

У 1974 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю па спецыяльнасці “Выяўленчае мастацтва”. З 1975 г. сябра Саюза мастакоў СССР.

Па **тэме дысертацыі надрукавала шэсць манаграфій.** Акрамя таго, выдала брашуру “Фёдар Зільберт” (творчы партрэт мастака-кераміста).

У 1983 г. была рэкамендавана да абароны доктарская дысертацыя, але яна не змагла паехаць у Маскву на абарону па сямейных абставінах.

Увогуле М. Яніцкая даследуе гісторыю культуры Беларусі X-XX стст., у тым ліку стан выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Яна першы аўтар шматлікіх фундаментальных артыкулаў у выдадзенай 12-ці томнай **“Беларускай Савецкай Энцыклапедыі”; “Кароткай Беларускай Савецкай Энцыклапедыі”** і **“Энцыклапедыі Літаратуры і Мастацтва Беларусі”;** аўтар артыкулаў энцыклапедычнага даведніка **“Францыск Скарына і яго час”** (1988 г. выдавецтва БелСЭ), а таксама выдання Інстытута Літаратуры АН БССР **“Скарына і яго эпоха”** Мн., 1990

Адзін з аўтараў шматтомнага выдання ІМЭФ АН БССР **“Гісторыя мастацтва Беларусі”.**

Яна навуковы рэдактар, член рэдкалегіі і адзін з аўтараў такога фундаментальнага выдання, як 7-мі томны **“Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі”.**

Навуковы кансультант 5-ці томнай “Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі”

Аўтар прадмовы і складальнік раздзелаў па шкле, фарфору, фаянсе і металапластыцы ў **каталогу** выставы Міністэрства культуры БССР у г. Плоцку (ПНР) пад назвай **“Мадэрн са збораў беларускіх музеяў”** (выд. у Плоцку на польскай мове ў 1990 г.)«

Складальнік і аўтар уступнага артыкула да Каталога выставы **“Падвойныя дываны са збору Польшчы і Беларусі”** (Мн. 1996).

Складальнік і аўтар прадмоў да двух **каталогаў выстаў суполкі , “Пагоня”** Саюза мастакоў Беларусі—”Адраджэнне-95", (Мн., 1996). **Суполка “Пагоня” Беларускага саюза мастакоў,** (Мн., 2002).

Адзін з аўтараў і навуковы рэдактар першага у Беларусі мультымедыйнага выдання **“Іканапіс. Традыцыйны касцюм. Архітэктура. 100 рарытэтаў з музеяў Беларусі”**, (Мн., 2000).

Складальнік раздзела **“Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва”** у альбоме **“Беларусь-трэцяму тысячагоддзю”**, прысвечанага выставе **“Беларускае мастацтва дваццатага стагоддзя”,** (Мн., 2003).

Складальнік і аўтар тэксту раздзела **“Кераміка”** ў альбоме **“Музей старажытнабеларускай культуры”**, (Мн, 2004)»

Аўтар тэксту раздзела **“Культура сёння”** у штогадовым выданні Міністэрства замежных спраў РБ **“Беларусь. Факты”**, (Мн., 2006).

Аўтар артыкулаў у перыядычным друку Беларусі, Украіны, Малдовы і Расіі, прысвечаных агляду выстаў розных відаў сучаснага мастацтва, а таксама аналізу твораў персанальных выстаў сучасных мастакоў Беларусі. Яна надрукавала **творчыя партрэты:**

жывапісцаў Ул. Мудрогіна, Ю. Дарашэвіча, К. Харашэвіча, А. Цыркунова, А. Марачкіна, В. Ціханава, Ул. Сулкоўскага;

габеленістаў Л. Пятруль і Т. Маркавец-Бартлавай;

графікаў Ул. Васюка і Я. Куліка;

керамістаў Т. Васюк, Л. Панамарэнкі, Ф. Зільберта;

мастакоў шкляной пластыкі У. Жохава, В. Дзвінскай, К. Вакс, В. Сазыкінай, Л. Мягковай, У. Мурахвера, Т. Малышавай, Г. Усаевіч, А. Федаркова, С. Лінкевіча;

мастака і мастацтвазнаўцы М. Раманюка і інш.

Яна адзін з аўтараў, першы складальнік і навуковы рэдактар **серыйнага выдання Беларускага фонду Культуры - зборнікаў “Вяртанне” (1992); “Вяртанне-2” (1994); “Вяртанне-3” (1996); “Вяртанне-4” (1997),** якія прысвечаны пошукам страчанай Беларуссю культурнай спадчыны X-XX стст.

Яна ж аўтар артыкулаў на гэтую ж тэму ў **Культуралагічным Бюлетэні “Кантакты і дыялогі”,** газеце **“Голас Радзімы”,** на радыё **“Свабода”.**

Нарэшце ёй удалося, дзякуючы ініцыятыве мастака Валерыя Левуніна, прыняць удзел **у альбоме “Слуцкія паясы”** у якасці складальніка і аўтара прадмовы. Аб выданні альбома Яніцкая марыла амаль 30 год, мара збылася толькі ў 2006 годзе.

М. Яніцкая ўзнагароджана **медалём “Ветэран працы”** (1989) і **медалём** Беларускага Саюза мастакоў **“За заслугі ў выяўленчым мас-тацтве”** (2001).

Усяго яна апублікавала 920 артыкулаў, у тым ліку ў энцыклапедычных выданнях - 542, 108 - у газетах, 195 - у зборніках, 75 - у часопісах. Прачытала 44 даклады на Міжнародных і Рэспубліканскіх Кангрэсах і семінарах.